ных отношений Беларуси, деятельность белорусских политических партий и общественных организаций.

В заключение следует подчеркнуть, что ролевое общение как форма организации занятий практики английской речи является очень перспективной формой обучения и воспитания студентов, что способствует созданию благоприятного психологического климата в аудитории, усиливает мотивацию учащихся, дает возможность использовать имеющиеся знания, опыт, навыки общения в разных ситуациях. Кроме того, особая активность студентов на занятиях в обсуждении духовных ценностей белорусского этноса, проблем сохранения самобытной культуры и языка, заинтересованность в улучшении материального и духовного благополучия страны доказывают то, что молодое поколение понимает необходимость творческой, созидательной работы на благо общества.

***С.В. Кухта***
БДЭУ (Мінск)

# ЦІ МОЖНА ВЫХАВАЦЬ ПАЧУЦЦЁ ПАТРЫЯТЫЗМУ ПРАЗ РОДНАЕ СЛОВА

Выхаванне патрыятызму праз роднае слова ў Беларусі яшчэ толькі пачынаецца. Адраджэнне беларускай культуры — складаны і шматгранны працэс, у аснове якога ляжыць пашана да роднай мовы як галоўнага духоўнага здабытку народа з усімі яго, на першы погляд, нават нязначнымі нацыянальнымі асаблівасцямі.

Для сучаснага развіцця грамадства характэрным з'яўляецца рост інфармацыі ва ўсіх відах чалавечай дзейнасці. Але незалежна ад таго, як яна распаўсюджваецца, усё роўна асновай існавання была і застаецца мова. Пры гэтым істотна ўзмацняецца яе камунікатыўная функцыя не толькі ў сваім традыцыйным сэнсе як спосаб і ажыццяўленне суразмоўніцтва, абмен вуснай і пісьмовай інфармацыяй паміж камунікантамі, але і ў выглядзе яе назапашвання і захавання, наладжванне кантактаў і рэгуляванне ўзаемаадносін паміж людзьмі. Важнае значэнне ў сучасных умовах, калі ў камп'ютэрных сістэмах ёсць спецыяльна распрацаваныя праграмы кантролю памылак, набывае не столькі пісьменнасць як самадастатковая каштоўнасць, колькі працэс стварэння і асэнсавання інфармацыі, якая поўнасцю залежыць ад маўленча-камунікатыўных здольнасцей чалавека. Розніца ва ўсведамленні функцыі мовы паміж нядаўнім мінулым і сучаснасцю даволі відавочная: трэба ўмець не толькі чытаць і пісаць, але і ўспрымаць, перапрацоўваць, ствараць і перадаваць інфармацыю.

Мова суправаджае свядомую дзейнасць чалавека на працягу ўсяго жыцця, таму ёй вучаць ад нараджэння. Мова выступае як сродак навучання, развіцця і патрыятычнага выхаваня асобы. Іншага раўназнач-

нага з мовай па сваіх магчымасцях дыдактычнага сродку педагогіка не мае, паколькі па значэнні яна звязана з чалавекам носьбітам свядомасці, а свядомасць знаходзіцца ў адзінстве з мовай і маўленнем.

Дасягненні кожнага народа ў развіцці навукі і культуры магчымы толькі пры непасрэдным удзеле роднай мовы. Вядомая беларуская паэтэса Цётка пісала: «Бедны той, хто... не мае скарбаў вечных — скарбаў душы. Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здолее, — гэта любоў да Бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы...»

Мова з'яўляецца сховішчам культуры, крыніцай пазнання, узбагачэння і развіцця. Змест і межы гэтага пазнання ўвесь час мяняюцца ў залежнасці ад дасягненняў цывілізацыі, патрэб грамадства. Менавіта гэтым тлумачацца змены ў змесце моўнай адукацыі і ў навучальных планах.

Асноўнай задачай адукацыі павінна стаць імкненне кожнага выкладчыка зрабіць родную мову аб'ектам сваёй асаблівай увагі і клопату ў накірунку развіцця маўленча-камунікатыўных здольнасцей чалавека, бо без іх немагчымы паспяховая адукацыя і выхаванне патрыятызму, г.зн. фарміраванне і ўзмацненне пачуццёвых адносін да Айчыны.

Аб выхаваўчых магчымасцях роднай мовы неаднойчы гаварыў Якуб Колас. Родную мову ён лічыў той крыніцай, з якой пазнаюцца жыццё, навакольны свет, бо гэта — крыніца адукацыі чалавечага розуму і пачуццяў. Вуснамі аднаго са сваіх герояў у рамане «На ростанях» пісьменнік сцвярджае галоўную мэту навучання. Яна ў тым, каб выхаваць сапраўднага грамадзяніна. «Чалавек жыве дзеля таго, каб рабіць дабро, каб служыць праўдзе, каб ствараць матэрыяльныя каштоўнасці і быць карысным для грамадства».

***В.Г. Москалев, К.А. Шумский***
БГАТУ (Минск)

## РОЛЬ ПРЕПОДАВАНИЯ ИСТОРИИ НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ В ФОРМИРОВАНИИ НАЦИОНАЛЬНОГО САМОСОЗНАНИЯ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ

Вступление Беларуси на путь самостоятельного развития поставило перед высшей школой в целом и перед историками — в частности, важные и непростые задачи: формирование национального самосознания студенческой молодежи, вовлечение ее в сферу культурной и духовной жизни нации, восстановление в полном объеме того исторического наследия, которое в недавнем прошлом объявлялось научно несостоятельным и идеологически вредным.

Долгие годы в результате государственной политики история Беларуси в гуманитарных высших учебных заведениях являлась всего лишь



БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by